

50 гадоў разам? Лёгка!

СТАР. 4



Гісторыя краіны ў банкнотах

СТАР. 5



«Цмокі», якіх не баяцца

СТАР. 10

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

18 ЛІСТАПАДА 2015 г. СЕРАДА № 223 (28081) Кошт 2300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## ПА ЗАКОНАХ ЭКАНОМІКІ І ЖЫЦЦЯ

### Усе прапановы МВФ прымаюцца, але выпрацаваная сістэма сацыяльнай дзяржавы застанецца

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка абмеркаваў з кіраўніком місіі Міжнароднага валютнага фонду па Беларусі Пітэрам Долманам прапановы МВФ датычна перспектыў узаемадзеяння і асноўных момантаў будучай праграмы.**

Аляксандр Лукашэнка падчас сустрэчы адзначыў, што ні адзін пункт, які прапануецца МВФ, не выклікае ў яго непрымання. Як лічыць кіраўнік дзяржавы, прапановы фонду заснаваны на абсалютна аб'ектыўных законах эканомікі, жыцця. «Формула адна: атрымліваеш паслугу — плаці за гэтую паслугу ў поўным аб'ёме», — сказаў ён.

Прэзідэнт з задавальненнем адзначыў, што Беларусь і МВФ дакладна выконваюць дамоўленасць па прапрацоўцы праграмы, якая павінна паслужыць асновай супрацоўніцтва, паведамляе прэс-служба беларускага лідара. Пытанне, паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, толькі ў тэрмінах. Пры гэтым кіраўнік дзяржавы выказаў упэўненасць, што ў дадзеным выпадку ў бакоў не будзе вельмі вялікай разбежкі «ў разуменні гэтых тэрмінаў і ў тэрмінах наогул». Беларускі бок нацэлены на тое, каб выпрацаваныя сумесна з фондам прапановы рэалізаваліся ў гранічна кароткі час.

У час сустрэчы Аляксандр Лукашэнка зрабіў акцэнт на тым, што ў Беларусі, падабаецца гэта фонду ці не, не маюць намеру ламаць выпрацаваную схему сацыяльнай дзяржавы. «Мы не можам пакінуць ні адно дзіця, ні аднаго старога, інваліда без дапамогі нашага грамадства, дзяржавы, — падкрэсліў Прэзідэнт. — У гэтым сэнс сацыяльнай дзяржавы. Мы не можам іх проста выкінуць на абочыну дарогі, па якой ідзём».

Усе астатнія прапановы фонду, як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, абсалютна рэалізуюцца ў Беларусі.

У сваю чаргу Пітэр Долман лічыць, што ў МВФ і беларускага боку адны мэты па пабудове эфектыўнай і развітой эканомікі Беларусі. Ён падзякаваў Прэзідэнту за адкрытасць, якую ён прадэманстраваў падчас сустрэчы. Па словах кіраўніка місіі МВФ, гэта служыць знакам вельмі прадукцыйнага ўзаемадзеяння, якое развіваецца паміж фондам і Беларуссю.

## ТАМІСЛАЎ НІКАЛІЧ ПРЫБЫВАЕ З АФІЦЫЙНЫМ ВІЗІТАМ

### Прэзідэнт Сербіі Таміслаў Нікаліч 18-20 лістапада наведае з афіцыйным візітам Беларусь

Кіраўнік беларускай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка і Прэзідэнт Сербіі правядуць перагаворы ў вузкім і пашыраным складах, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара. Кіраўнікі дзвюх краін падпішуць сумесную заяву.

Плануецца, што Аляксандр Лукашэнка і Таміслаў Нікаліч наведаюць будаўнічую пляцоўку эксперыментальнага шматфункцыянальнага комплексу «Мінск-Мір», дзе прымуць удзел у цырымоніі закладкі памятнай капсулы, якая сімвалізуе пачатак яго будаўніцтва.

Чакаецца, што ў дні афіцыйнага візіту Таміслаў Нікаліч наведае адкрытае акцыянернае таварыства «Мінскі трактарны завод», Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

# Салдацкая восень

### Каля 10 тысяч юнакоў гэтай восенню папоўняць армейскія рады краіны. Прыкладна 2 тысячы пройдуць службу ў рэзерве

**Пачалася адпраўка новага папаўнення ва Узброеныя Сілы, іншыя войскі і воінскія фарміраванні Беларусі. Першымі ў армейскія рады трапілі прадстаўнікі сіл спецыяльных аперацый, сухапутных войск, Ваеннай камендатуры Узброеных Сіл і ўнутраных войск Міністэрства ўнутраных спраў — усяго амаль 1200 прызыўнікоў. Іншыя воінскія часці краіны будуць забяспечаны навабранцамі да канца лістапада, у тым ліку тымі, хто пройдзе службу ў рэзерве.**

СТАР. 3







Фота Надзеі БУЖАН.

ЦЫТАТА ДНЯ



**Людміла НАРОЙЧЫК, намеснік галоўнага ўрача Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя:**

*«Міністэрства аховы здароўя выступіла з ініцыятывай аб далейшым урэгуляванні антытытунёвага заканадаўства. Ініцыяваны наступныя пытанні. Па-першае, заканадаўчае рэгуляванне электронных цыгарэт. Усё больш навуковых даследаванняў пацвярджаюць іх шкоду для чалавечага арганізма. Прапанова заключаецца ў тым, каб прыраўняць электронныя цыгарэты да звычайных тытунёвых вырабаў. Гэта значыць, што ўсе абмежаванні, звязаныя са звычайнымі цыгарэтамі, будуць тычыцца і электронных (узроставы цэнз, месцы продажу і курэння). Па-другое, зроблены захады па значным пашырэнні пераліку грамадскіх месцаў, дзе курэнне будзе цалкам забаронена. У прыватнасці, абмежаванне курэння плануецца распаўсюдзіць на такія грамадскія месцы, як рэстараны, кавярні, сферы забаўляльнага і гасцінічнага бізнесу, пляжы, прыпынкі грамадскага транспарту».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 18.11.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 17896,00 | ▲ |
| Еўра | 19062,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 273,43 | ▲ |
| Укр. грыўня | 748,79 | ▼ |

## ГАЛОЎНАЯ ЗАДАЧА ДНЯ

### Прэм'ер-міністр Андрэй Кабякоў запатрабаваў ад урада прыняцця аператыўных і сістэмных мер для аднаўлення эканамічнага росту

**Аб гэтым кіраўнік урада заявіў на пашыраным пасяджэнні Савета Міністраў, падчас якога разглядаліся вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі сёлета ў студзені-верасні, перадае БЕЛТА.**



Фота БЕЛТА.

«Ад Савета Міністраў патрабуецца прыняцце аператыўных і сістэмных мер, каб пашырыць вузкія месцы ў эканамічным развіцці, не парушаючы збалансаванасці эканомікі. Галоўнай задачай урада і Нацыянальнага банка ва ўмовах няўстойлівасці і высокай нестабільнасці на сусветных рынках было і ёсць забеспячэнне макраэканамічнай устойлівасці і захаванне неабходнага ўзроўню сацыяльнай абароны насельніцтва», — адзначыў Андрэй Кабякоў.

Паводле яго слоў, краіна ў поўным аб'ёме і ва ўстаноўленыя тэрміны разлічваецца па валютных даўгах без урону для міжнародных рэзервовых актываў. На пагашэнне асноўнага доўгу накіроўваецца прафіцыт рэспубліканскага бюджэту, які па выніках 9 месяцаў склаў Br16,4 трлн, або 2,6 працэнта ВУП.

«Валютны рынак стабільны, чысты продаж валюты насельніцтвам і суб'ектамі гаспадарання з пачатку года — амаль $350 млн. Збалансаваны знешні гандаль. Па сальда гандлю таварамі і паслугамі маем лепшы вынік за апошнія 15 гадоў — за 9 месяцаў $1,2 млрд. Як вынік, палепшыўся стан плацежнага балансу краіны», — канстатаваў прэм'ер-міністр.

Андрэй Кабякоў адзначыў, што ў Беларусі выконваюцца ўсе абавязацельствы бюджэту па сацыяльных выплатах, па дзяржаўнай падтрымцы рэальнага сектара эканомікі. Разам з тым па выніках студзеня-верасня эканамічнага росту не адбылося. «ВУП ніжэйшы за мінулы год на 3,7 працэнта за 9 месяцаў, на 3,9 працэнта — за 10 месяцаў. Аб'ёмы прамысловай вытворчасці апошнія тры месяцы стаяць на ўзроўні 92,9 працэнта. Гэта значыць па прамысловасці не падаем, але і не расцём», — растлумачыў кіраўнік беларускага ўрада.

Прэм'ер міністр паставіў задачу забяспечыць аднаўленне эканамічнага росту, выконваючы тры асноўныя прыярытэты: не нарошчваць знешні доўг, максімальна знізіць залежнасць ад знешніх фактараў, забяспечыць устойлівы збалансаваны рост без раскручвання інфляцыйнай і дэвальвацыйнай спіралей. «Асноўныя крыніцы росту на гэтым этапе і пры такіх умовах — экспарт і інвестыцыі», — лічыць Андрэй Кабякоў.

## РАЗАБРАЦЦА І ДАПАМАГЧЫ

**Прамая лінія з Мікалаем МЕЛЬЧАНКАМ, намеснікам міністра ўнутраных спраў — начальнікам міліцыі грамадскай бяспекі, у рэдакцыі «Звязды» прайшла вельмі актыўна. Цягам дзвюх гадзін нашы чытачы пыталіся і аб паркоўках на зялёных зонах, і аб шумных суседзях, футбольных балельшчыках. Як запэўніў намеснік міністра, кожнае пытанне ў міліцыі абавязкова вывучаць і пастараюцца дапамагчы. А пакуль прапануем адказы на найбольш актуальныя з іх.**




Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

***— Мікалай Аляксандравіч, пачаць нашу прамую лінію хацелася б пытаннем ад «Звязды». На жаль, узнікла яно па віне тых, хто датычны да тэракта ў Парыжы. Ці будзе наша міліцыя з прычыны інцыдэнту ў Францыі ўзмацняць нясенне службы?***

— У сувязі з трагедыяй у Парыжы органы ўнутраных спраў Беларусі прымаюць адэкватныя меры. Здавалася б, Францыя знаходзіцца ад нас далёка, але гэта не азначае, што мы не будзем рэагаваць. У месцах масавага знаходжання людзей узмоцнена нясенне службы міліцыі. Больш актыўна праводзяцца даглядныя мерапрыемствы, асабліва на чыгуначных вакзалах, аўтастанцыях, у метрапалітэне. Мы не павінны расслабляцца і мусім быць больш пільнымі. Хацелася б адчуць гэтую пільнасць і ад нашых грамадзян. Самі разумееце, у кожным куце супрацоўнікаў міліцыі не расставім. І людзі павінны з разуменнем ставіцца да гэтых мер.

Надоечы мы атрымалі паведамленне аб замініраванні станцыі метро «Магілёўская». І ў тым ліку дзякуючы пільнасці нашых грамадзян мы выявілі, выкрылі правапарушальніка, які паведаміў заведама лжывую інфармацыю, за што ён панясе ўстаноўленую законам адказнасць. Мы ўдзячныя за гэта нашым грамадзянам.

Як бачна, прафілактычная праца і органаў унутраных спраў, і іншых сілавых ведамстваў прыносіць свае вынікі.

СТАР. 3

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### $50 млн за інфармацыю аб датычных да выбуху на борце A321

За інфармацыю аб датычных да выбуху на борце лайнера A321 авіякампаніі «Кагалымавія», які пацярпеў крушэнне над Сінайскім паўвостравам, абвешчана ўзнагарода ў $50 млн. Пра гэта паведамілі ў Цэнтры грамадскіх сувязяў ФСБ Расіі. У ведамстве падкрэслілі, што «ў выніку расследавання прычын авіякатастрофы самалёта A321 устаноўлена: паветранае судна пацярпела крушэнне ў выніку прывядзення ў дзеянне выбуховага прыстасавання, што кваліфікавана як тэракт».

### Улады Туніса прадухілілі буйны тэракт



Улады Туніса заявілі аб прадухіленні буйнога тэракта. Па падазрэнні ў яго падрыхтоўцы затрымана 17 чалавек. «Мы сарвалі планы па правядзенні маштабнага тэракта, які тэрарысты планавалі ажыццявіць у гэтым месяцы, каб прыўнесці хаос у краіну. Яго цэлямі павінны былі стаць найважнейшыя аб'екты інфраструктуры, гатэлі, паліцэйскія ўчасткі і палітыкі», — заявіў міністр унутраных спраў Туніскай Рэспублікі Рафік Чэлі. Паводле яго слоў, баевікі былі падрыхтаваны ў Лівіі і Сірыі і чакалі загаду, каб пачаць атаку. Раней Туніс ужо падвяргаўся нападам: 26 чэрвеня турыстаў, якія адпачывалі на пляжы пяцізоркавага гатэля каля горада Сус, атакаваў тэрарыст. Ахвярамі тэракта сталі 38 чалавек, яшчэ каля 40 атрымалі раненні. Большасць загінулых — брытанцы.

## ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### СААЗ: людзі няправільна ўжываюць антыбіётыкі

Людзі ва ўсім свеце недастаткова інфармаваны аб дзеянні антыбіётыкаў на арганізм. Эксперты Сусветнай арганізацыі аховы здароўя прыйшлі да такой высновы, правёўшы даследаванне ў 12 краінах. Былі апытаны каля 10 тысяч чалавек. Згодна з вынікамі, 64% апытаных перакананы, што антыбіётыкі дапамагаюць вылечыць прастуду і грып. Больш за тое, каля трэці рэспандэнтаў лічыць, што можна перастаць прымаць антыбіётыкі пры першых прыкметах паляпшэння стану, гэта значыць, яшчэ да заканчэння курса прыёму лекаў. А 25% апытаных гатовы прымаць антыбіётыкі, якія параілі ім сябры ці блізкія, калі ў тых былі падобныя сімптомы захворвання. На думку экспертаў СААЗ, насельніцтва недастаткова інфармавана аб росце ўстойлівасці бактэрый да антыбіётыкаў. Апошнія здольны забіваць мікробы і бактэрыі, але яны не аказваюць уздзеяння на вірусы. СААЗ нагадвае, што няправільнае выкарыстанне супрацьмікробных прэпаратаў паскарае з'яўленне лекава ўстойлівых штамаў у свеце, і ў выніку змагацца з інфекцыямі становіцца ўсё цяжэй. Так, у кастрычніку былі апублікаваны вынікі іншага даследавання, згодна з якім, у ЗША штогод памірае больш за 6 тысяч чалавек з прычыны зніжэння эфектыўнасці антыбіётыкаў.

## КОРАТКА

**Праязныя білеты на грамадскі транспарт Мінска на 10, 15 і 30 дзён хутка можна будзе купіць з любой даты.**

Нацыянальны банк Беларусі ўводзіць у абарачэнне з 20 лістапада памятныя манеты «Вушатая сава» серыі «Птушка года».

**Сёння ў сталіцы налічваецца больш як 5 тысяч кватэр камерцыйнага выкарыстання. Кошт арэнды аднапакаёвай кватэры ў сталіцы складае ад Br765 тысяч да Br2,3 млн, двухпакаёвай — ад Br1 млн да Br3,2 млн, трохпакаёвай — ад Br1,3 млн да Br4 млн.**

«Белпошта» пачала прымаць заказы на віншаванні ад Дзеда Мароза. У гонар святкавання Сусветнага дня дзіцяці з 20 па 30 лістапада будзе дзейнічаць зніжка 10 працэнтаў.

■ Фінансы

## ІСТОТНЫ ДАХОД ЗАХАВАЛІ ТОЛЬКІ «ДОЎГІЯ» ДЭПАЗІТЫ

### Спецыялісты фінансавага рынку: «Цяпер кліенты будуць вымушаны больш уважліва ставіцца да ўмоў, што прапісаны ў дагаворы па ўкладах»



**Пасля ўступлення ў сілу дэкрэта №7 у дэпазітнай лінейцы ўжо адбыліся маштабныя змяненні. Толькі за некалькі апошніх дзён банкі стварылі адразу каля трох дзясяткаў новых укладаў, а больш за паўсотню дэпазітаў «у старой рэдакцыі» ўвогуле перастала існаваць.**

### ТЭРМІН ВЯЛІКІ, А СТАЎКА «ПЛАВАЕ»?

Вядома, што дэкрэт з 12 лістапада падраздзяляе ўклады на безадзыўныя і адзыўныя. Па безадзыўных укладах для фізічных асоб Нацбанк краіны на мінулым тыдні рэкамендаваў фінансавым інстытутам пакінуць працэнтную стаўку на ранейшым узроўні, а вось па адзыўных укладах — паменшыць на 3-5%.

Па безадзыўных укладах большасць нашых банкаў так і зрабіла. Максімальная стаўка па такіх зафіксаваных па часе дэпазітах (дзе не прадугледжана датэрміновае зняцце грошай) вагаецца ад 26 да 30%. Сёння нават па гэтых безадзыўных укладах існуюць варыянты цалкам нераўназначныя. Адна справа, калі трэба падпісацца пад дагаворам, які забараняе здымаць грошы са свайго дэпазіту на працягу 3 месяцаў, і зусім іншая, калі ўклад нельга чапаць на працягу года ці двух-трох. А розніца ў працэнтным даходзе па такіх розных варыянтах складае толькі 2-3 працэнты.

СТАР. 5

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.

5 разоў на тыдзень!

Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым падарункам для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.

Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал 2016 года!